**128. У Рэчы Паспалітай паступова фарміравалася сваеасаблівая супольнасць – «польскі народ...»:**

а) духоўны; б) шляхецкі;
в) сялянскі; г) мяшчанскі.

**129. Тэрмін «ліберум вета» – гэта ў літаральным перакладзе:**

а) агульная справа; б) вольнае забараняю;
в) незвычайны стан; г) права на рокаш.

**130. Часовае аб'яднанне шляхты ў XVIII ст. з мэтай падтрымкі ўзброенай сілай тых ці іншых палітычных патрабаванняў – гэта:**

а) саюз; б) групоўка;
в) канфедэрацыя; г) альянс.

**131. Прыклад дазволенай законам узброенай шляхецкай апазіцыі ўладзе ў ВКЛ і Польшчы – гэта:**

а) вырак; б) віж;
в) гіцль; г) рокаш.

**132. Чатырохгадовы Сойм Рэчы Паспалітай працаваў у:**

а) 1785–1788 гг.; б) 1788–1791 гг.;
в) 1791–1793 гг.; г) 1793–1795 гг.

**133. 3 мая 1791 г. у Рэчы Паспалітай была прынята:**

а) пастанова аб I падзеле Рэчы Паспалітай;
б) Канстытуцыя Рэчы Паспалітай;
в) пастанова аб скасаванні прыгоннага права ў Рэчы Паспалітай;
г) трактат аб II падзеле Рэчы Паспалітай.

**134. Ад каго атрымала падтрымку Барская канфедэрацыя ў Рэчы Паспалітай:**

а) Паўночны Саюз; б) Паўднёвы Саюз;
в) Турцыя; г) Расія.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**135. Канфедэрацыя, утвораная пасля выдання Канстытуцыі Рэчы Паспалітай, якая аб'яднала прыхільнікаў «залатых шляхецкіх вольнасцей»:**

а) Барская; б) Слуцкая;
в) Таргавіцкая; г) Торуньская.

**136. Паўстаннем 1794 г. на тэрыторыі ВКЛ кіраваў:**

а) М. К. Агінскі; б) С. Грабоўскі;
в) Я. Ясінскі; г) С. Панятоўскі.

**137. Хто з краін-удзельніц падзелаў Рэчы Паспалітай атрымаў землі Беларусі:**

а) Аўстрыя; б) Прусія;
в) Польшча; г) Расія.

**138. Апошні кароль Рэчы Паспалітай – гэта:**

а) Сігізмунд III Ваза;
б) Стэфан Баторы;
в) Станіслаў Аўгуст Панятоўскі;
г) Аўгуст Саксонскі.

**139. Пасля якіх гістарычных падзей Рэч Паспалітая як дзяржава знікла з палітычнай карты Еўропы:**

а) пасля «крывавага патопу» 1654–1667 гг.;
б) пасля Паўночнай вайны 1700–1721 гг.;
в) у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай;
г) ніколі не знікала.

**140. Вызначце хранал агічныя межы існавання Рэчы Паспалітай:**

а) XIII ст. – 1772 г.; б) XIII ст. – 1795 г.;
в) 1569–1772 гг.; г) 1569–1795 гг.

**141. Ям-Запольскі мір паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай пасля завяршэння Лівонскай вайны быў падпісаны:**

а) 15 лютага 1563 г.; б) 26 студзеня 1564 г.;
в) 1 ліпеня 1569 г.; г) 15 студзеня 1582 г.

**142. У гісторыі Беларусі падзеі 1648–1651 гг. – гэта:**

а) вайна Рэчы Паспалітай з Расійскай дзяржавай;
б) вайна Рэчы Паспалітай са Швецыяй;
в) інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай ў Маскоўскую дзяржаву;
г) казацка-сялянская вайна.

**143. Самая буйная бітва на тэрыторыі Беларусі пад час казацка-сялянскай вайны 1648–1651 гг. адбылася пад:**

а) Слуцкам; б) Лоевам;
в) Менскам; г) Полацкам.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**144. Шляхецкае войска ў час казацка-сялянскай вайны 1648–1651 гг. узначальваў:**

а) Канстанцін Астрожскі; б) Міхаіл Глінскі;
в) Рыгор Хадкевіч; г) Януш Радзівіл.

**145. Утварылася ў XV ст. з сялянаў і гарадскіх жыхароў, якія ўцякалі на малазаселеныя землі Вялікага княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы. Стварыла сваю арыгінальную сацыяльна-эканамічную, вайсковую і палітычную арганізацыю. Доўгі час стрымлівала напады крымскіх татараў і туркаў на землі ВКЛ. Адыграла значную ролю ў разгортванні падзей антыфеадальнай вайны 1648–1651 гг. на тэрыторыі Беларусі. Вызначце, пра каго ідзе гаворка:**

а) паспалітае рушанне; б) казацтва;
в) атрады шышоў; г) войска Маскоўскай дзяржавы.

**146. Асноўнай прычынай вайны паміж Расійскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай у 1654–1667 гг. было:**

а) вызваленне беларускага народа ад польскага прыгнету;
б) вызваленне сялян ад прыгону;
в) захоп беларускіх зямель і атрыманне выхаду да Балтыйскага мора;
г) абарона праваслаўя.

**147. Дзе было заключана перамір'е паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай у 1667 г.:**

а) Смаленск; б) Віцебск;
в) Андрусава; г) Востраў.

**148. У час Паўночнай вайны 1700–1721 гг. буйное сражэнне на тэрыторыі Беларусі, якое Пётр I назваў «маці Палтаўскай баталіі», адбылося пад:**

а) Бярэсцем; б) Віцебскам;
в) Галоўчынам; г) Лясной.

**149. Калі адбылася бітва пад в. Лясной:**

а) у 1608 г.; б) у 1708 г.;
в) у 1709 г.; г) у 1808 г.

**150. У час Паўночнай вайны ў бітве пад Лясной 28 верасня 1708 г. шведскія войскі ўзначальваў генерал:**

а) Левенгаўпт; б) Лефорт;
в) Пляўэн; г) Эстэргазі.

**151. Калі адбылося антыфеадальнае выступленне сялян у Крычаўскім старостве:**

а) 1740–1744 гг.; б) 1754–1756 гг.;
в) 1740 г.; г) 1750 г.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**152. Кіраўнік антыфеадальнага выступлення беларускіх сялян у Крычаўскім старостве 1740–1744 гг. – гэта:**

а) Багдан Хмяльніцкі;

б) Васіль Вашчыла;

в) Іясафат Кунцэвіч;

г) Стахор Мітковіч.

**153. Прывілеяванае саслоўе, буйныя землеўладальнікі, арыстакраты – прадстаўнікі радавітай знаці ў Польшчы, Літве, Беларусі і Украіне ў XIII – пачатку XX ст. – гэта:**

а) купцы; б) магнаты;

в) мяшчане; г) шляхта.

**154. Прывілеяванае саслоўе, ваенна-служылы люд у Польшчы, Літве і Беларусі ў XIII – пачатку XX ст.:**

а) купцы; б) магнаты;

в) мяшчане; г) шляхта.

**155. Будынак у горадзе, дзе знаходзіліся органы самакіравання, – гэта:**

а) веча; б) ратуша;

в) рада; г) юрыдыка.

**156. Саслоўе XVI–XVIII стст., прадстаўнікі якога плацілі падаткі на карысць феадала, называлася:**

а) духавенства; б) магнаты;

в) шляхта; г) сяляне.

**157. Саслоўе XVI–XVIII стст., прадстаўнікі якога плацілі падаткі, называлася:**

а) духавенства; б) шляхта;

в) магнаты; г) мяшчане.

**158. Гаспадарка адной сялянскай сям'і і адзінка абкладання павіннасцямі:**

а) дым; б) фальварак;

в) ваколіца; г) цэх.

**159. Двор і гаспадарка землеўладальніка, арыентаваная на выраб сельскагаспадарчай прадукцыі на продаж:**

а) фабрыка; б) цэх;

в) фальварак; г) майстэрня.

**160. Буйны гандлёвы шлях:**

а) магістраль; б) траса;

в) гасцінец; г) трэк.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**161. Замежным гандлем у беларускіх гарадах у XVI–XVIII стст. займаліся:**

а) партачы; б) каморнікі;
в) госці; г) прасолы.

**162. Фальварак – гэта:**

а) асноўная зямельная мера ў ВКЛ;
б) гаспадарка селяніна ў ВКЛ;
в) двор феадала ў ВКЛ, які складаўся з комплексу будынкаў і панскіх засеваў;
г) частка дзяржаўных уладанняў, неабкладаемая падаткамі.

**163. Дакумент, у якім апісваліся феадальныя ўладанні разам з насельніцтвам, зямлёй, гаспадаркай і сялянскімі павіннасцямі, – гэта:**

а) валока; б) інвентар;
в) латыфундыя; г) устава.

**164. Феадальныя зямельныя ўладанні ў Рэчы Паспалітай, вылучаныя з дзяржаўных земляў для задавальнення патрэб караля і прыдворнай казны, меўшыя ўласнае адміністрацыйна-гаспадарчае кіраванне, – гэта:**

а) валока; б) эканомія;
в) інвентар; г) латыфундыя.

**165. Дзяржаўны маёнтак, які даваў кароль ці вялікі князь у часовае карыстанне феадалам за службу, меўшы за гэта чвэрць прыбытку ў казну штогод, – гэта:**

а) валока; б) інвентар;
в) латыфундыя; г) староства.

**166. Часовае карыстанне маёмасцю за абумоўленую плату – гэта:**

а) арэнда; б) латыфундыя;
в) паншчына; г) рэнта.

**167. Народны звычай калектыўнай дапамогі ў гаспадарчых работах, які выкарыстоўвалі і феадалы ВКЛ, – гэта:**

а) фальварак; б) талака;
в) паншчына; г) валока.

**168. Капіталістычнае прадпрыемства, заснаванае на ручной працы і шырокім яе падзеле, – гэта:**

а) латыфундыя; б) мануфактура;
в) рамесніцкі цэх; г) фабрыка.

**169. Першыя мануфактуры ў Беларусі ўзніклі ў:**

а) XV ст.;
б) канцы XVII ст.;
в) першай палове XVIII ст.;
г) другой палове XVIII ст.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## III. СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ (XVIII ст. – 1917 г.)

**1. I падзел Рэчы Паспалітай адбыўся ў:**

а) 1772 г.; б) 1792 г.;
в) 1793 г.; г) 1794 г.

**2. II падзел Рэчы Паспалітай адбыўся ў:**

а) 1772 г.; б) 1793 г.;
в) 1794 г.; г) 1795 г.

**3. III падзел Рэчы Паспалітай адбыўся ў:**

а) 1772 г.; б) 1793 г.;
в) 1794 г.; г) 1795 г.

**4. Адзначце прозвішча палкоўніка, які ўзначаліў паўстанне 1794 г. на тэрыторыі ВКЛ:**

а) Ясінскі; б) Агінскі;
в) Касакоўскі; г) Каліноўскі.

**5. Адзначце прозвішча кіраўніка паўстання 1794 г. у Рэчы Паспалітай:**

а) Касцюшка; б) Каліноўскі;
в) Ясінскі; г) Агінскі.

**6. Па адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле ў канцы XVIII ст. беларускія землі падзяляліся на:**

а) ваяводствы – паветы – уезды;
б) ваяводствы – правінцыі – раёны;
в) вобласці – раёны – ключы;
г) генерал – губернатарствы – губерні – паветы – ключы.

**7. У канфесійнай палітыцы пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі ўлады безумоўна падтрымлівалі:**

а) каталіцкую царкву; б) праваслаўную царкву;
в) уніяцкую царкву; г) пратэстантскую царкву.

**8. Указ аб увядзенні «мяжы яўрэйскай аселасці» ў беларуска-літоўскіх і украінскіх губернях быў выдадзены ў:**

а) 1772 г.; б) 1794 г.;
в) 1856 г.; г) 1861 г.

**9. Беларуская крэпасць, якая ў час вайны 1812 г. так і не была ўзята французамі, знаходзілася ў:**

а) Бабруйску; б) Віцебску;
в) Полацку; г) Старым Быхаве.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**10. Орган кіравання, якому ў 1812 г. падпарадкоўваліся Віленскі, Мінскі, Гродзенскі і Беластоцкі дэпартаменты над час напалеонаўскай акупацыі беларускіх зямель, – гэта:**

а) Вышэйшая Нацыянальная Рада;
б) Часовы ўрад ВКЛ;
в) Найвышэйшая Літоўская Рада;
г) Сейм Рэчы Паспалітай.

**11. Жыхары якой беларускай вёскі атрымалі ўрадавыя ўзнагароды за мужнасць, праяўленую пад час вайны 1812 г.:**

а) Жарцы Полацкага павета;
б) Клясціцы Полацкага павета;
в) Салтанаўка Магілёўскага павета;
г) Студзёнкі Барысаўскага павета.

**12. Пасля якой бітвы на тэрыторыі Беларусі адыход арміі Напалеона Банапарта ператварыўся ў бязладныя ўцёкі:**

а) каля в. Студзёнкі; б) пад Малаяраслаўцам;
в) пад Мірам; г) пад Смаленскам.

**13. Галоўная форма арганізацыі грамадска-палітычнага руху на Беларусі ў першай палове XIX ст.:**

а) баявыя групы;
б) пралетарскія кружкі;
в) тайныя і паўлегальныя таварыствы;
г) палітычныя партыі.

**14. Утварэнне «таварыства філаматаў» адбылося ў:**

а) 1817 г.; б) 1820 г.;
в) 1832 г.; г) 1839 г.

**15. «Філамат» у перакладзе з грэчаскай мовы – гэта:**

а) вольны муляр;
б) вольны хлебапашац;
в) той, хто імкнецца да ведаў;
г) той, хто любіць дабрачыннасць.

**16. Утварэнне «таварыства філарэтаў» адбылося ў:**

а) 1817 г.; б) 1820 г.;
в) 1832 г.; г) 1839 г.

**17. «Філарэт» у перакладзе з грэчаскай мовы – гэта:**

а) паўстанец;
б) той, хто імкнецца да ведаў;
в) той, хто любіць дабрачыннасць;
г) вольны муляр.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**18. Асноўнае ядро ў паўстанцкіх атрадах у Польшчы, Беларусі і Літве ў 1830–1831 гг. складалі:**

а) сяляне; б) рабочыя;
в) шляхта; г) мяшчане.

**19. Вызначце галоўную мэту паўстання 1830–1831 гг.:**

а) адмена прыгоннага права;
б) аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.;
в) аднаўленне Люблінскай уніі 1569 г.;
г) аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1795 г.

**20. Кансерватыўна-арыстакратычную плынь у паўстанні 1830–1831 гг. узначальваў:**

а) Міхал Клеафас Агінскі; б) Кастусь Каліноўскі;
в) Іаахім Лялевель; г) Адам Чартарыйскі.

**21. Шляхецка-рэвалюцыйную плынь у паўстанні 1830–1831 гг. узначальваў:**

а) Міхал Клеафас Агінскі; б) Кастусь Каліноўскі;
в) Іаахім Лялевель; г) Адам Чартарыйскі.

**22. Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. на тэрыторыі Беларусі праводзілася палітыка:**

а) падтрымкі каталіцкай царквы;
б) падтрымкі уніяцкай царквы;
в) русіфікацыі;
г) паланізацыі.

**23. «Разбор шляхты» – гэта:**

а) люстрацыя маёнткаў удзельнікаў паўстання 1830–1831 гг.;
б) комплекс мерапрыемстваў царскага ўрада, накіраваных на раздрабленне сіл беларуска-польскага дваранства і падарванне яго магутнасці;
в) падзеі паўстання 1830–1831 гг.;
г) палітыка царскага ўрада, накіраваная на кансалідацыю беларуска-польскага дваранства і ўмацаванне яго пазіцый.

**24. Заснавальнікам “Дэмакратычнага таварыства” ў 1836–1838 гг. у Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі быў:**

а) Шыман Канарскі; б) Васіль Нораў;
в) Франц Савіч; г) Міхал Шыманскі.

**25. Назва тайнай арганізацыі 40–х гг. XIX ст. у Літве і на Беларусі:**

а) «Братні саюз літоўскай моладзі» («Саюз свабодных братоў»);
б) «Таварыства ваенных сяброў»;
в) «Таварыства філаматаў»;
г) «Таварыства філарэтаў».



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**26. Люстрацыя – гэта:**

а) канфіскацыя царкоўнай маёмасці на карысць дзяржавы;

б) ліквідацыя уніяцкай царквы;

в) перыядычнае апісанне дзяржаўнай маёмасці;

г) вайсковая павіннасць.

**27. Аўтарам рэформы кіравання дзяржаўнымі сялянамі з'яўляецца:**

а) П. Кісялёў; б) А. Бенкендорф;

в) Мікалай І; г) Аляксандр І.

**28. Мануфактура – гэта:**

а) вялікая панская шматгаліновая гаспадарка, якая заснавана на прыгоннай працы;

б) прамысловае прадпрыемства, якое заснавана на ручной вытворчасці з падзелам працы;

в) дакумент, у якім запісаны нормы павіннасцей сялян у адпаведнасці з колькасцю і якасцю іх зямельных надзелаў;

г) падрабязнае апісанне дзяржаўных маёнткаў.

**29. Вызначце формулу тэорыі афіцыйнай народнасці:**

а) «Вольнасць, цэласць, незалежнасць»;

б) «Праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць»;

в) «Мір хрысціянству, а на зачыншчыкаў Бог і крыж»;

г) «Не рухаць даўніны, не ўводзіць навіны».

**30. Адмена прыгоннага права ў Расійскай імперыі адбылася ў:**

а) 1825 г.; б) 1861 г.;

в) 1884 г.; г) 1898 г.

**31. Якая з буржуазных рэформ у Расійскай імперыі не была праведзена ў Беларусі ў 60–70-х г. XIX ст.:**

а) цэнзурная; б) вайсковая;

в) земская; г) судовая.

**32. Адзначце прозвішча кіраўніка паўстання 1863–1864 гг.:**

а) Касцюшка; б) Каліноўскі;

в) Ясінскі; г) Агінскі.

**33. Фарміраванне першых паўстанцкіх атрадаў на тэрыторыі Беларусі пад час паўстання 1863–1864 гг. пачалося ў:**

а) студзені 1863 г.; б) сакавіку-красавіку 1863 г.;

в) жніўні 1863 г.; г) кастрычніку 1863 г.

**34. Паўстанне 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі і Літвы было практычна падаўлена ў:**

а) студзені 1863 г.; б) сакавіку-красавіку 1863 г.;

в) жніўні 1863 г.; г) кастрычніку 1863 г.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**35. Падаўленне паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі і ў Літве ўзначальваў:**

а) М. Мураўёў; б) І. Паскевіч;
в) А. Сувораў; г) І. Ферзен.

**36. На тэрыторыі Беларусі часоваабавязанае становішча сялян было скасавана царскім урадам пад уздзеяннем падзей:**

а) паўстання 1830–1831 гг.;
б) паўстання 1863–1864 гг.;
в) рэвалюцыі 1905–1907 гг.;
г) Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

**37. Перыяд 80–90-х гг. XIX ст. у гісторыі Расіі і Беларусі – гэта:**

а) перыяд буржуазных рэформаў;
б) перыяд рэформ П. Кісялёва;
в) перыяд рэформ П. Сталыпіна;
г) перыяд контррэформаў.

**38. Якую назву мела першая агульнарасійская народніцкая арганізацыя:**

а) «Народная воля»; б) «Чорны перадзел»;
в) «Зямля і воля»; г) «Гоман».

**39. Тактыку «хаджэння ў народ» выкарыстоўвалі:**

а) эсэры; б) бальшавікі;
в) Бунд; г) народнікі.

**40. Народнікі ў другой палове XIX ст. лічылі галоўнай рухаючай сілай рэвалюцыі:**

а) буржуазію; б) духавенства;
в) рабочых; г) сялянства.

**41. Рэвалюцыянер-народнік, выхадзец з Беларусі, які прымаў удзел у замаху на Аляксандра II у 1881 г.:**

а) Яўген Спонці; б) Ігнацій Грынявіцкі;
в) Станіслаў Трусевіч; г) Вацлаў Сяліцкі.

**42. I з'езд РСДРП адбыўся:**

а) у 1898 г. у Мінску; б) у 1897 г. у Мінску;
в) у 1897 г. у Маскве; г) у 1898 г. у Вільна.

**43. Вызначце характар рускай рэвалюцыі 1905–1907 гадоў:**

а) буржуазная; б) буржуазна-дэмакратычная;
в) дэмакратычная; г) пралетарская.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**44. Якую назву атрымалі падзеі 9 студзеня 1905 г.:**

а) курлаўскі растрэл; б) крывавая надзеля;
в) свянцянскі прарыў; г) разбор шляхты.

**45. Дзяржаўная Дума ў Расійскай імперыі ўзнікла ў выніку:**

а) Першай сусветнай вайны;
б) Першай Расійскай рэвалюцыі;
в) рэформы 1861 г.;
г) паўстання 1863 г.

**46. 17 кастрычніка 1905 г. адбылося:**

а) абвяшчэнне Маніфеста Мікалая II;
б) абвяшчэнне Маніфеста Аляксандра II;
в) курлаўскі растрэл;
г) роспуск II Дзяржаўнай Думы.

**47. Якую пазіцыю займалі ў адносінах да выбараў у I Дзяржаўную Думу ў Расіі рэвалюцыйныя партыі:**

а) байкатавалі выбары;
б) падтрымалі выбары;
в) прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы выбараў;
г) учынілі жорсткі палітычны тэрор.

**48. Земствы на тэрыторыі Беларусі былі ўведзены ў:**

а) 1864 г.; б) 1906 г.;
в) 1907 г.; г) 1911 г.

**49. Газета «Наша ніва» ў пачатку Першай сусветнай вайны выступала з пазіцый:**

а) праўрадавых; б) манархічных;
в) шавіністычных; г) антываенных.

**50. Якая партыя ў час Першай сусветнай вайны выступала з лозунгам «ператварэння вайны імперыялістычнай у вайну грамадзянскую супраць свайго ўрада»:**

а) ПСР; б) БСГ;
в) РСДРП; г) Бунд.

**51. Прамысловы пераварот на тэрыторыі Беларусі пачаўся ў:**

а) канцы XVIII ст.; б) пачатку XIX ст.;
в) сярэдзіне XIX ст.; г) канцы XIX ст.

**52. Адыходніцтва – гэта:**

а) зыход сялян з вёскі на заробкі;
б) перасяленне сялян з еўрапейскай часткі Расіі за Урал;
в) уцёкі сялян па рэлігійных матывах;
г) уцёкі сялян ад прыгону.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**53. Першыя фабрыкі на тэрыторыі Беларусі ў Косаве і Холмску належалі:**

а) П. Кісялёву; б) В. Пуслоўскаму;
в) К. Радзівілу; г) А. Тызенгаўзу.

**54. Якая з беларускіх губерняў займала першанства па колькасці занятых у прамысловасці ў сярэдзіне XIX ст.:**

а) Гродзенская; б) Магілёўская;
в) Мінская; г) Віцебская.

**55. Па палажэннях сялянскай рэформы 1861 г. сяляне да набыцця адведзеных ім надзелаў называліся:**

а) казённыя; б) прыватнаўласныя;
в) сяляне-ўласнікі; г) часоваабавязаныя.

**56. Па палажэннях сялянскай рэформы 1861 г. часоваабавязанае становішча сялян патрабавала ад іх безумоўнага:**

а) выканання раней ускладзеных павіннасцей на карысць памешчыка;
б) высялення сялян за межы вёскі;
в) звядзення ўсіх зямельных адрэзкаў у адзіны надзел – адруб;
г) набыцця крэдыту ў Пазямельным банку.

**57. Па палажэннях сялянскай рэформы 1861 г. выкупныя плацяжы – гэта:**

а) безумоўны абавязак селяніна выконваць раней ускладзеныя павіннасці на карысць памешчыка;
б) грашовая выплата селяніна за атрыманы зямельны надзел;
в) набыты крэдыт у Пазямельным банку;
г) працэдура высялення сялян за межы вёскі, на хутар.

**58. Адрэзкі ў парэформенны перыяд – гэта:**

а) зведзеныя ў адзіны надзел-адруб сялянскія зямельныя ўчасткі;
б) землі, адабраныя ад памешчыка на карысць сялян;
в) частка зямель, адрэзаных ад абшчынных;
г) частка зямель, якая пры пераліку лічылася для сялян звышнарматыўнай.

**59. Адмена прыгоннага права ў 1861 г. у Расіі спрыяла развіццю ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы Беларусі:**

а) першабытнаабшчынных адносін;
б) рабаўладальніцкіх адносін;
в) феадальных адносін;
г) капіталістычных адносін.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**60. Сутнасць якой сістэмы гаспадарання пасля 1861 г. заключалася ў апрацоўцы памешчыцкай зямлі інвентаром сялян, якія атрымлівалі за гэта ад памешчыка зямельныя ўгоддзі ў арэнду:**

а) адпрацовачнай;
б) капіталістычны найм;
в) фальваркова-паншчыннай;
г) натуральнай гаспадаркі.

**61. Сутнасць якой сістэмы гаспадарання заключалася ў найме рабочых, якія апрацоўвалі зямлю інвентаром і цяглавай сілай уладальніка:**

а) адпрацовачнай;
б) феадальнай;
в) фальваркова-паншчыннай;
г) капіталістычнай.

**62. З'ява, для якой характэрна несуадносінасць колькасці наяўнага зямельнага фонду і меўшайся вялікай колькасці сельскіх гаспадароў, – гэта:**

а) аграрная перанаселенасць;
б) аграрная напружанасць;
в) адпрацовачная сістэма;
г) натуральная гаспадарка.

**63. Каму належыла большасць зямельных уладанняў на тэрыторыі Беларусі пасля рэформы 1861 г.:**

а) гарадам і ўстановам;
б) дваранам (памешчыкам);
в) дзяржаве;
г) сялянам.

**64. Стан эканомікі, выкліканы цяжкасцямі збыту прадукцыі сельскагаспадарчай вытворчасці, падзеннем цэн на яе, – гэта:**

а) аграрны крызіс; б) рэвалюцыя;
в) рэформа; г) стагнацыя.

**65. Непасрэдным вынікам аграрнага крызісу 80–90-х г. XIX ст. на тэрыторыі Беларусі было:**

а) змяненне эканамічнай арганізацыі і тэхнічнай аснашчанасці сельскай гаспадаркі;
б) змяненне спецыялізацыі сельскай гаспадаркі;
в) сацыяльная дыферэнцыяцыя сялянства;
г) разбурэнне сялянскай абшчыны.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**66. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

а)

– адмена часоваабавязанага становішча на тэрыторыі Беларусі;

– адмена прыгоннага права ў Расіі;

– аграрная рэформа П. Сталыпіна;

– утварэнне земстваў у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях;

б)

– адмена прыгоннага права ў Расіі;

– адмена часоваабавязанага становішча на тэрыторыі Беларусі;

– аграрная рэформа П. Сталыпіна;

– утварэнне земстваў у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях;

в)

– аграрная рэформа П. Сталыпіна;

– утварэнне земстваў у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях;

– адмена прыгоннага права ў Расіі;

– адмена часоваабавязанага становішча на тэрыторыі Беларусі;

г)

– утварэнне земстваў у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях;

– адмена часоваабавязанага становішча на тэрыторыі Беларусі;

– адмена прыгоннага права ў Расіі;

– аграрная рэформа П. Сталыпіна.

**67. Якую стадыю праходзіць развіццё капіталізму ў прамысловасці акрамя дробнай вытворчасці і мануфактуры:**

а) індустрыяльную;

б) феадальную;

в) фабрычна-завадскую;

г) постындустрыяльную.

**68. Чаму большасць прамысловых прадпрыемстваў на тэрыторыі Беларусі была размешчана ў сельскай мясцовасці:**

а) з-за нізкай рэнтабельнасці мясцовай вытворчасці;

б) таму, што яны спецыялізаваліся на пераапрацоўцы мясцовай сельскагаспадарчай і лясной сыравіны;

в) па прычыне разгортвання прамысловай рэвалюцыі;

г) па прычыне інтэнсіўнага будаўніцтва чыгунак.

**69. Сярод гарадскога насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX ст. па нацыянальным складзе пераважалі:**

а) яўрэі; б) рускія;

в) беларусы; г) палякі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**70. Форма арганізацыі вытворчасці, прамысловае прадпрыемства, заснаванае на выкарыстанні машын, – гэта:**

а) брацтва; б) мануфактура;
в) рамесны цэх; г) фабрыка (завод).

**71. Першыя выступленні рабочых ў 60–70-х гг. XIX ст. на тэрыторыі Беларусі мелі:**

а) вызваленчы характар; б) антыфеадальны характар;
в) палітычны характар; г) эканамічны характар.

**72. Галоўным напрамкам спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі ў 90-я гг. XIX ст. з'яўлялася:**

а) малочная жывёлагадоўля; б) вытворчасць збожжа;
в) садоўніцтва; г) вытворчасць цукровых буракоў.

**73. У нацыянальным складзе сельскагаспадарчых рабочых Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. пераважалі:**

а) беларусы; б) палякі;
в) рускія; г) яўрэі.

**74. Што было характэрна для развіцця прамысловасці на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX ст.:**

а) высокі ўзровень канцэнтрацыі вытворчасці;
б) панаванне фабрычна-завадской вытворчасці;
в) надзвычай высокія тэмпы развіцця цяжкай прамысловасці;
г) маруднае выцясненне рамеснай і мануфактурнай вытворчасці і нізкі ўзровень канцэнтрацыі вытворчасці і рабочай сілы.

**75. У якім з пералічаных ніжэй беларускіх гарадоў электрычны трамвай з'явіўся раней, чым у Пецярбургу і Маскве:**

а) Гомель; б) Гродна;
в) Віцебск; г) Мінск.

**76. Першая чыгунка на тэрыторыі Беларусі прайшла ў:**

а) 1817 г.; б) 1834 г.;
в) 1862 г.; г) 1871 г.

**77. Першая чыгунка на тэрыторыі Беларусі прайшла праз горад:**

а) Брэст-Літоўск; б) Гродна;
в) Оршу; г) Менск.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

## IV. СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ І ЎМАЦАВАННЕ ЯЕ СУВЕРЭНІТЭТУ Ў XX – пачатку XXI ст.

**1. Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя адбылася ў:**

а) кастрычніку 1916 г.; б) кастрычніку 1915 г.;
в) кастрычніку 1918 г.; г) кастрычніку 1917 г.

**2. Па характары Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. была:**

а) буржуазнай;
б) буржуазна-дэмакратычнай;
в) нацыянальна-вызваленчай;
г) сацыялістычнай.

**3. У выніку перамогі Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі была ўсталявана ўлада:**

а) Краёвай Рады; б) Часовага ўраду;
в) Саветаў; г) двоеўладдзя.

**4. Камітэт выратавання рэвалюцыі пад час падзей Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Мінску ўзначальваў:**

а) Т. Калатухін; б) К. Ландар;
в) А. Мяснікоў; г) М. Рагазінскі.

**5. Стаўка была ліквідавана ў Магілёве:**

а) 10 лістапада 1917 г.; б) 20 лістапада 1917 г.;
в) 20 лістапада 1918 г.; г) не была ліквідавана ўвогуле.

**6. Першы Усебеларускі з'езд адбыўся ў Мінску:**

а) 25–26 кастрычніка 1917 г.;
б) 2 лістапада 1917 г.;
в) 15–17 снежня 1917 г.;
г) 2–3 лютага 1919 г.

**7. БНР была абвешчана:**

а) 1 студзеня 1919 г.; б) 25 сакавіка 1918 г.;
в) 9 сакавіка 1918 г.; г) 2 (15) сакавіка 1918 г.

**8. Першая Устаўная грамата Рады БНР была прынята:**

а) 21 лютага 1918 г.; б) 9 сакавіка 1918 г.;
в) 25 сакавіка 1918 г.; г) 1 студзеня 1919 г.

**9. Другая Устаўная грамата Рады БНР была прынята:**

а) 21 лютага 1918 г.; б) 9 сакавіка 1918 г.;
в) 25 сакавіка 1918 г.; г) 1 студзеня 1919 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**10. Трэцяя Устаўная грамата Рады БНР была прынята:**
а) 21 лютага 1918 г.; б) 9 сакавіка 1918 г.;
в) 25 сакавіка 1918 г.; г) 1 студзеня 1919 г.

**11. Аб стварэнні БССР было абвешчана:**
а) 31 ліпеня 1920 г. у Мінску;
б) 1 студзеня 1919 г. у Смаленску;
в) 25 кастрычніка 1917 г. у Мінску;
г) 2 лютага 1919 г. у Мінску.

**12. Старшыня першага Часовага ўрада Савецкай Беларусі:**
а) Я. Адамовіч; б) З. Жылуновіч;
в) К. Ландар; г) А. Мяснікоў.

**13. 18 сакавіка 1921 г. адбылося:**
а) падпісанне Брэсцкага міру паміж Расіяй і краінамі германскага блоку;
б) падпісанне Рыжскага міру паміж Расіяй і Польшчай;
в) пачатак мірных перамоў паміж Расіяй і Германіяй;
г) пачатак мірных перамоў паміж Расіяй і саюзнікамі па Антанце.

**14. Надзвычайная эканамічная палітыка савецкай улады ў гады грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі 1918–1920 гг. – гэта:**
а) ваенны камунізм; б) індустрыялізацыя;
в) калектывізацыя; г) НЭП.

**15. Сістэма нарыхтовак сельгаспрадукцыі ў перыяд ваеннага камунізму, якая была ўсталявана пасля ўвядзення харчовай дыктатуры і звязвалася з абавязкам сялян здаваць дзяржаве лішкі прадукцыі, – гэта:**
а) дыктатура; б) калектывізацыя;
в) пераварот; г) харчразвёрстка.

**16. Вызначце крытэрыі рэквізіцый у сялян у часы ваеннага камунізму:**
а) па рашэнні сялянскага сходу;
б) па сярэдняй ураджайнасці ў губерні;
в) заходзячы з памераў зямельнага надзелу;
г) дакладных крытэрыяў не было.

**17. У сакавіку 1921 г. на тэрыторыі Беларусі адбыўся:**
а) пераход да палітыкі ваеннага камунізму;
б) пераход да нэпа;
в) пераход да палітыкі беларусізацыі;
г) пачатак ажыццяўлення індустрыялізацыі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**18. Вызначце храналагічныя межы нэпа:**

а) 1917–1920 гг.; б) 1918–1921 гг.;
в) 1921–1929 гг.; г) 1924–1929 гг.

**19. Рашэнне аб замене харчовай развёрсткі харчовым падаткам было прынята на:**

а) VIII Усерасійскім з'ездзе Саветаў у снежні 1920 г.;
б) X з'ездзе РКП(б) у сакавіку 1921 г.;
в) XI з'ездзе РКП(б) у сакавіку 1922 г.;
г) IX з'ездзе РКП(б) у сакавіку 1920 г.

**20. Новая эканамічная палітыка (нэп) – гэта:**

а) аб'яднанне аднаасобных дробнатаварных сялянскіх гаспадарак у буйнатаварныя калектыўныя;
б) палітыка савецкага ўрада, якая грунтавалася на выкарыстанні прынцыпаў таварна-грашовых адносін і матэрыяльнай зацікаўленасці працаўніка;
в) надзвычайная эканамічная палітыка Савецкай улады ў гады грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі 1918–1921 гг.;
г) пераход прамысловасці ад мелкай да буйной машыннай.

**21. Хутарызацыя на тэрыторыі Беларусі – гэта:**

а) палітыка ў галіне сельскай гаспадаркі, накіраваная на разбурэнне хутарскіх гаспадарак і пераарыентацыю на калектыўныя формы гаспадарання;
б) пераход ад ручной працы да буйной фабрычна-заводскай вытворчасці;
в) палітыка аб'яднання дробных індывідуальных сялянскіх гаспадарак у буйныя калектыўныя;
г) умоўная назва палітыкі ў галіне сельскай гаспадаркі Беларусі ў 20-я гг. XX ст., заснаванай на заахвочванні развіцця хутарскіх гаспадарак.

**22. Пачатак стварэння энергетыкі на тэрыторыі Беларусі быў пакладзены будаўніцтвам у 1926 г.:**

а) БелДРЭС пад Оршай; б) Бярозаўскай ДРЭС;
в) Лукомльскай ДРЭС; г) Мінскай ТЭЦ–1.

**23. Зачэпкай да згортвання нэпа было:**

а) забойства Кірава; б) хлебанарыхтоўчы крызіс 1927–1928 гг.;
в) стракапытаўскі мяцеж; г) кранштадтскі мяцеж.

**24. Аўтарам праекта аўтанамізацыі па ўтварэнні Саюза Савецкіх рэспублік у 1920-я гг. з'яўляўся:**

а) М. Бухарын; б) З. Жылуновіч;
в) У. Ленін; г) І. Сталін.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**25. Аўтарам праекта федэрацыі па ўтварэнні Саюза Савецкіх рэспублік у 1920-я гг. з'яўляўся:**

а) М. Бухарын; б) З. Жылуновіч;
в) У. Ленін; г) І. Сталін.

**26. СССР быў утвораны:**

а) 3 сакавіка 1918 г.; б) 1 студзеня 1919 г.;
в) 3 лютага 1919 г.; г) 30 снежня 1922 г.

**27. 30 снежня 1922 г. з'яўляецца днём утварэння СССР таму, што ў гэты дзень:**

а) адбылося адкрыццё ВДНГ;
б) былі падпісаны Дэкларацыя і Дагавор аб утварэнні СССР;
в) завяршалася дзеянне папярэдніх міждзяржаўных дамоўленасцей;
г) пачаў працу I з'езд Саветаў.

**28. Першае тэрытарыяльнае ўзбуйненне БССР адбылося ў:**

а) 1920 г.; б) 1921 г.;
в) 1924 г.; г) 1926 г.

**29. Другое тэрытарыяльнае ўзбуйненне БССР адбылося ў:**

а) 1920 г.; б) 1921 г.;
в) 1924 г.; г) 1926 г.

**30. Калектывізацыя – гэта:**

а) аб'яднанне аднаасобных дробнатаварных сялянскіх гаспадарак у буйнатаварныя калектыўныя;

б) надзвычайная эканамічная палітыка Савецкай улады ў гады грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі 1918–1921 гг.;

в) палітыка савецкага ўрада, якая грунтавалася на выкарыстанні прынцыпаў таварна-грашовых адносін і матэрыяльнай зацікаўленасці працаўніка;

г) пераход прамысловасці ад мелкай да буйной машыннай.

**31. Гвалтоўныя дзеянні ў дачыненні да сялянства, ліквідацыя кулацтва, з якім атаясамліваліся ўсе нязгодныя з палітыкай дзяржавы ў вёсцы, – гэта:**

а) калектывізацыя;
б) кааперацыя;
в) нацыянал-дэмакратызм;
г) раскулачванне.

**32. Тэрыторыя Заходняй Беларусі апынулася ў складзе Польшчы згодна ўмовам:**

а) Брэсцкага міру; б) Версальскага міру;
в) Портсмутскага міру; г) Рыжскага міру.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

**33. Паланізацыя – гэта:**

а) звядзенне ў адзін надзел дробных сялянскіх палосак з адначасовым высяленнем на хутар;

б) комплекс мерапрыемстваў палітыкі польскіх улад у дачыненні да беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі з мэтай апалячвання;

в) палітыка польскага ўрада, накіраваная на свабоднае развіццё нацыянальных меншасцей;

г) продаж польскаму насельніцтву часткі памешчыцкай зямлі дробнымі ўчасткамі.

**34. Самай масавай палітычнай арганізацыяй Заходяй Беларусі ў 1921–1939 гг. была:**

а) Камуністычная партыя Заходняй Беларусі;

б) Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў;

в) Беларуская сялянска-рабочая грамада;

г) Беларуская хрысціянская дэмакратыя.

**35. Народны сход, што прыняў рашэнне аб уз'яднанні Заходняй Беларусі з БССР, адбыўся:**

а) у кастрычніку 1938 г. у Беластоку;

б) у лістападзе 1938 г. у Варшаве;

в) у кастрычніку 1939 г. у Беластоку;

г) у лістападзе 1939 г. у Варшаве.

**36. Пакт аб ненападзе паміж Германіяй і СССР быў падпісаны:**

а) 23 жніўня 1939 г.; б) 28 жніўня 1939 г.;

в) 28 верасня 1939 г.; г) 1 верасня 1939 г.

**37. Другая сусветная вайна пачалася 1 верасня 1939 г. з:**

а) бамбардыровак нямецкай авіяцыяй Англіі;

б) нападу Германіі на Польшчу;

в) нападу Германіі на СССР;

г) нападу СССР на Фінляндыю.

**38. Савецкія войскі ўступілі ў Заходнюю Беларусь:**

а) 23 жніўня 1939 г.; б) 28 жніуня 1939 г.;

в) 1 верасня 1939 г.; г) 17 верасня 1939 г.

**39. Вызначце храналагічныя межы Вялікай Айчыннай вайны:**

а) 1 верасня 1939 г. – 2 верасня 1945 г.;

б) 17 верасня 1939 г. – 9 мая 1945 г.;

в) 22 чэрвеня 1941 г. – 9 мая 1945 г.;

г) 22 ліпеня 1941 г. – 9 мая 1945 г.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**40. Вызначце храналагічныя межы Другой сусветнай вайны:**

а) 1 верасня 1939 г. – 2 верасня 1945 г.;

б) 17 верасня 1939 г. – 9 мая 1945 г.;

в) 22 чэрвеня 1941 г. – 8 мая 1945 г.;

г) 22 ліпеня 1941 г. – 9 мая 1945 г.

**41. Кодавая назва вайсковай аперацыі нападу Германіі на СССР:**

а) «Барбароса»; б) «Тайфун»;

в) «Оверлорд»; г) «Фатэрланд».

**42. Вызначце назву нямецка-фашысцкага плану каланізацыі і германізацыі Усходняй Еўропы ў час Другой сусветнай вайны:**

а) «Ост»; б) «Барбароса»;

в) «Тайфун»; г) «Оверлорд».

**43. Бліцкрыг – гэта:**

а) сістэма мерапрыемстваў, якая праводзілася для ізаляцыі тэрыторыі дзяржавы;

б) сістэма мерапрыемстваў, якая праводзілася на акупіраванай тэрыторыі;

в) тактыка і стратэгія каланіяльнай вайны;

г) тэорыя хуткага вядзення вайны з дасягненнем перамогі ў найкарацейшы тэрмін.

**44. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі ажыццяўляла наступленне нямецкая група армій:**

а) «Остланд»; б) «Поўнач»;

в) «Поўдзень»; г) «Цэнтр».

**45. Адзін з буйнейшых танкавых баёў у першапачатковы перыяд вайны, ў якім прымала ўдзел каля 1,500 танкаў з абодвух бакоў, адбыўся:**

а) 6 ліпеня 1941 г. пад Лепелем;

б) 28 чэрвеня 1941 г. пад Мінскам;

в) 14 ліпеня 1941 г. пад Оршай;

г) 11 ліпеня 1941 г. пад Гомелем.

**46. Падзеі абароны якога беларускага горада ў Вялікай Айчыннай вайне апісаў пісьменнік Канстанцін Сіманаў у рамане «Жывыя і мёртвыя»:**

а) Брэста; б) Віцебска;

в) Магілёва; г) Мінска.

**47. На чале Генеральнага камісарыята Беларусі ў час акупацыі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся:**

а) бургамістр; б) валасны старшыня;

в) гебіткамісар; г) генеральны камісар.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**48. Генеральным камісарам Беларусі да верасня 1943 г. быў:**

а) А. Готберг; б) В. фон Кубе;
в) К. Клаўзевіц; г) К. Людэндорф.

**49. Тыя, хто супрацоўнічаў з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ў час Другой сусветнай вайны, – гэта:**

а) акупанты; б) інсургенты;
в) калабаранты; г) канфедэраты.

**50. Буйнейшы на акупіраванай тэрыторыі БССР і СССР канцэнтрацыйны лагер смерці, у якім знішчана 206,5 тысяч чалавек, па колькасці ахвяр стаіць на чацвёртым месцы пасля Асвенцыма, Майданэка і Трэблінкі – гэта:**

а) Азарычы; б) Бярозавецкі;
в) Дразды; г) Трасцянец.

**51. Хто быў стваральнікам першага партызанскага атрада на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны:**

а) К. С. Заслонаў; б) М. Ф. Шмыроў;
в) В. З. Корж; г) Ц. П. Бумажкоў і Ф. І. Паўлоўскі.

**52. Першымі з беларускіх партызан, якім было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, з'яўляліся:**

а) В. Корж і М. Шмыроў;
б) С. Прытыцкі і В. Харужая;
в) Ц. Бумажкоў і Ф. Паўлоўскі;
г) К. Заслонаў і П. Машэраў.

**53. Цэнтральным штабам партызанскага руху у гады Вялікай Айчыннай вайны кіраваў:**

а) М. Зімянін; б) П. Калінін;
в) П. Машэраў; г) П. Панамарэнка.

**54. Беларускі штаб партызанскага руху пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання ўзначальваў:**

а) К. С. Заслонаў; б) І. І. Матусевіч;
в) П. З. Калінін; г) І. П. Казінец.

**55. «Камітэт садзеяння Чырвонай Арміі» – назва падпольнай арганізацыі, якая дзейнічала ў горадзе:**

а) Магілёў; б) Мінск;
в) Брэст; г) Віцебск.

**56. «Рэйкавая вайна» – гэта:**

а) недапушчэнне ўгону насельніцтва на работы ў Германію;
б) умоўная назва карнай аперацыі нямецкіх акупантаў супраць партызан;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

в) умоўная назва спланаванай стратэгічнай аперацыі партызан па разбурэнні чыгуначных камунікацый;

г) знішчэнне гарнізонаў акупантаў.

**57. У час Вялікай Айчыннай вайны падпольная ваенная арганізацыя, якая падпарадкоўвалася польскаму эмігранцкаму ўраду ў Лондане:**

а) Армія Краёва; б) Армія Людова;

в) «Веер»; г) «Нармандыя-Нёман».

**58. Канфігурацыя савецка-германскага фронту, якая склалася да чэрвеня 1944 г., атрымала назву:**

а) «беларускі балкон»; б) «беларуская дуга»;

в) «фатэрлянд»; г) «беларуская крэпасць».

**59. Вызваленне Беларусі пачалося:**

а) у верасні 1944 г.; б) у верасні 1943 г.;

в) у чэрвені 1944 г.; г) у студзені 1944 г.

**60. Першы раённы цэнтр Беларусі, вызвалены ў час Вялікай Айчыннай вайны 23 верасня 1943 г.:**

а) Гомель; б) Калінкавічы;

в) Камарын; г) Мазыр.

**61. Першы абласны цэнтр Беларусі, вызвалены ў час Вялікай Айчыннай вайны 26 лістапада 1943 г.:**

а) Брэст; б) Віцебск;

в) Гомель; г) Магілёў.

**62. Вайсковая аперацыя Чырвонай Арміі ў час Вялікай Айчыннай вайны па вызваленні Беларусі мела назву:**

а) «Сатурн»; б) «Беларускі балкон»;

в) «Баграціён»; г) «Веер».

**63. Аперацыя «Баграціён» пачалася ў:**

а) верасні 1944 г.; б) верасні 1943 г.;

в) чэрвені 1944 г.; г) ліпені 1944 г.

**64. Што сімвалізуюць чатыры штыкі-абеліскі Кургана Славы, узведзенага ля шашы Мінск–Масква:**

а) гарады-героі Мінск, Масква, Ленінград, Кіеў;

б) чатыры рэспублікі – ўдзельніцы Вялікай Айчыннай вайны;

в) чатыры франты – ўдзельнікі вызвалення Беларусі;

г) чатыры абласныя цэнтры, вызваленыя пад час аперацыі «Баграціён».

**65. Вызваленне Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адбылося:**

а) 28 чэрвеня1941 г.; б) 28 верасня 1943 г.;

в) 3 ліпеня 1944 г.; г) 28 ліпеня 1944 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**66. У час правядзення вайсковай аперацыі па вызваленні Беларусі «Баграціён» была практычна знішчана нямецкая група армій:**

а) «Альдэнбург»; б) «Поўнач»;
в) «Поўдзень»; г) «Цэнтр».

**67. Аднаўленчыя мерапрыемствы на Беларусі пачаліся:**

а) адразу пасля вызвалення першых раёнаў і абласцей Беларусі ад нямецкай акупацыі;

б) адразу пасля завяршэння Вялікай Айчыннай вайны;

в) пасля заканчэння аперацыі «Баграціён» і поўнага вызвалення тэрыторыі БССР;

г) пасля завяршэння Другой сусветнай вайны.

**68. Аднаўленчыя мерапрыемствы ў БССР былі завершаны:**

а) адразу пасля завяршэння Вялікай Айчыннай вайны;

б) пасля завяршэння II сусветнай вайны;

в) у выніку выканання чацьвёртага пяцігадовага плана аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі;

г) пасля заканчэння аперацыі "Баграціён" і поўнага вызвалення тэрыторыі БССР.

**69. У 1957 г. у СССР была праведзена спроба рэфармавання кіраўніцтва эканомікай. Адбылася замена галіновага прынцыпу кіравання на тэрытарыяльны. Новыя органы кіравання эканомікай – гэта:**

а) саўнаргасы;

б) эканамічныя раёны;

в) свабодныя эканамічныя зоны;

г) аграрна-прамысловыя комплексы.

**70. Колькі ў БССР у 1950-я гг. было створана саўнаргасаў:**

а) адзін;

б) па колькасці абласцей;

в) па колькасці раёнаў;

г) па колькасці абласцей, раёнаў і рэспубліканскі.

**71. Перыяд 1953–1964 гг. у пасляваеннай гісторыі Беларусі – гэта перыяд:**

а) аднаўлення гаспадаркі і захавання таталітарызму;

б) «хрушчоўскай адлігі»;

в) стагнацыі;

г) «перабудовы і дэмакратызацыі».

**72. Галоўным вынікам XX з'езда КПСС было:**

а) прыняцце курсу на перабудову;

б) прыняцце новай праграмы КПСС;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

в) прыняцце курсу на пабудову рыначнай эканомікі;
г) асуджэнне культу асобы Сталіна.

**73. Адна з найбольш рашучых і выніковых спроб радыкальных змен у эканоміцы СССР была зроблена ў:**

а) 1965 г.; б) 1953 г.;
в) 1945 г.; г) 1977 г.

**74. Дзе знаходзіцца беларускае прамысловае прадпрыемства «Беларуськалій»:**

а) Наваполацк; б) Новалукомль;
в) Рэчыца; г) Салігорск.

**75. Якую назву атрымаў перыяд савецкай гісторыі, калі на чале КПСС быў Л. І. Брэжнеў:**

а) таталітарызму; б) «адлігі»;
в) застою; г) перабудовы.

**76. У 1985 г. палітыку «перабудовы» пачаў:**

а) Л. І. Брэжнеў; б) К. У. Чарненка;
в) Ю. У. Андропаў; г) М. С. Гарбачоў.

**77. Вызначыце напрамак у палітыцы «перабудовы»:**

а) аднаўленне гаспадаркі; б) «адліга»;
в) стагнацыя; г) дэмакратызацыя.

**78. Калі была прынята «Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР»:**

а) 27 ліпеня 1990 г.; б) 19 верасня 1991 г.;
в) 27 жніўня 1991 г.; г) 21 жніўня 1991 г.

**79. А. Р. Лукашэнка ўпершыню быў абраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у:**

а) маі 1994 г.; б) ліпені 1994 г.;
в) снежні 1991 г.; г) лістападзе 1993 г.

**80. У ліпені 1994 г. адбылося:**

а) выбары першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;
б) абвяшчэнне Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі;
в) прыняцце Вярхоўным Саветам БССР Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце;
г) падпісанне ў Віскулях Пагаднення аб стварэнні СНД.

**81. Апошнія выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адбыліся ў:**

а) сакавіку 1994 г.; б) ліпені 1994 г.;
в) снежні 2001 г.; г) кастрычніку 2015 г.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**82. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была прынята ў:**

а) сакавіку 1994 г.; б) ліпені 1994 г.;
в) снежні 2001 г.; г) лістападзе 2010 г.

**83. Па выніках рэферэндуму 1995 г. статус дзяржаўнай мовы акрамя беларускай атрымала:**

а) англійская мова; б) руская мова;
в) польская мова; г) нямецкая мова.

**84. Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) па выніках рэферэндуму 1996 г. адзначаецца:**

а) 9 мая; б) 25 жніўня;
в) 2 верасня; г) 3 ліпеня.

**85. Парламент Рэспублікі Беларусь – гэта:**

а) Дзяржаўная Дума; б) Сейм;
в) Нацыянальны сход; г) Рада.

**86. Беларусізацыя – гэта:**

а) забарона ўжывання беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадска-палітычнага і культурнага жыцця;

б) комплекс мерапрыемстваў на пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі, накіраваных на развіццё нацыянальнай мовы, культуры, навукі і адукацыі;

в) палітыка афіцыйных улад, якая садзейнічала нацыянальна-культурнаму будаўніцтву на Беларусі ў перыяд 1924–1929 гг.;

г) палітыка ў галіне сельскай гаспадаркі, якая была накіравана на развіццё фермерскай вытворчасці ў выглядзе хутароў і дробных адрэзкаў.

**87. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт пачаў сваю работу ў:**

а) 1919 г.; б) 1921 г.;
в) 1922 г.; г) 1924 г.

**88. Кінастудыя мастацкіх фільмаў, адкрытая ў 1928 г. у Ленінградзе, мела назву:**

а) «Беларусьфільм»; б) «Жыве Беларусь»;
в) «Савецкая Беларусь»; г) «Чырвоная Беларусь».

**89. Першы беларускі паэт, які ў пасляваенны час атрымаў Сталінскую прэмію:**

а) Аркадзь Куляшоў за «Сцяг брыгады»;
б) Кандрат Крапіва за «Хто смяецца апошнім»;
в) Максім Танк за «Люцыян Таполя»;
г) Міхась Лынькоў за «Векапомныя дні».

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**90. Аўтарам рамана «Чорны замак Альшанскі» з'яўляецца:**

а) Максім Танк; б) Васіль Быкаў;
в) Уладзімір Караткевіч; г) Юрый Семяняка.

**91. Беларускі мастак, аўтар цыкла карцін «Лічбы на сэрцы»:**

а) Анатоль Анікейчык; б) Уладзімір Солтан;
в) Міхаіл Савіцкі; г) Заір Азгур.

**92. Вызначце галоўную тэму ў беларускай літаратуры і выяўленчым мастацтве ў пасляваенныя гады:**

а) батальная; б) сацыялістычнага будаўніцтва;
в) гістарычная; г) ваенная.

**93. Мемарыяльныя комплексы «Хатынь» і «Курган Славы» пад Мінскам былі адкрыты ў:**

а) 1965 г.; б) 1969 г.;
в) 1971 г.; г) 1975 г.

**94. Фестываль эстраднай песні «Славянскі базар» пачаў праводзіцца штогод з 1992 г. у :**

а) Мінску; б) Магілёве;
в) Віцебску; г) Міры.

**95. Вядомы беларускі пісьменнік, удзельнік вайны, аўтар твораў «У тумане», «Аблава», «Сцюжа», намінант на атрыманне Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры ў 1994 г., памер у 2004 г.:**

а) Васіль Быкаў; б) Алесь Адамовіч;
в) Святлана Аляксіевіч; г) Іван Мележ.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ЗМЕСТ

I. ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАГА ЭТНАСУ (VI – пачатак XX ст.) ............... 3

II. ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎТВАРЭННІ НА БЕЛАРСКІХ ЗЕМЛЯХ
У IX–XVIII стст. ............... 18

III. СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ (канец XVIII ст. – кастрычнік 1917 г.) ............... 37

IV. СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ І ЎМАЦАВАННЕ ЯЕ СУВЕРЭНІТЭТУ Ў XX – пачатку XXI ст. ............... 47

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучэбнае выданне

**Апіок** Тамара Уладзіміраўна
**Каляснёва** Вольга Вячаславаўна

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Кантрольныя заданні
для студэнтаў негістарычных факультэтаў

Тэхнічны рэдактар *А. Л. Пазнякоў*
Кампютарная вёрстка *І. Р. Куранцаў*
Карэктар *І. І. Талкачова*

Падпісана ў друк 10.11.2016 .Фармат 60x84/16.
Гарнітура Times New Roman. Ум.-друк. 3,5 арк.
Ул.-выд. 4,1 арк. Тыраж 50 экз. Заказ № 362.

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А. А. Куляшова, 212022 Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/131 ад 03.01.2014 г.

Надрукавана ў аддзеле аператыўнай паліграфіі
МДУ імя А. А. Куляшова. 212022, Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова